# ПАДРЫХТОЎКА НА ВЫДАТНА

***Напрыканцы сакавіка прайшоў заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па 18 вучэбных прадметах. Яго ўдзельнікамі сталі 1527 хлопцаў і дзяўчат з усіх рэгіёнаў Беларусі. Найбольшую колькасць дыпломаў заваявалі вучні з Віцебскай вобласці. Такі вынік стаў магчымым дзякуючы, у тым ліку, выкладчыкам ВДУ, якія таксама рыхтавалі вучняў да алімпіяды. Да таго ж яны працавалі членамі журы.***

Заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры праходзіў у Магілёве. Ён складаўся з водгуку на літаратурны твор і лінгвістычнага конкурсу. Заданні былі падрыхтаваны з улікам юбілейнай даты – 140-годдзя з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа.



**Святлана МАРТЫНКЕВІЧ, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, член журы:**

«Творы для напісання водгуку былі прысвечаны гістарычнай памяці народа, раскрывалі патрыятычную і філасофскую тэмы. Лінгвістычныя заданні патрабавалі не толькі добрага ведання тэарэтычных аспектаў мовы і зместу твораў літаратуры, але і кемлівасці, творчага падыходу да рашэння лінгвістычных задач і ацэнкі літаратурных фактаў.

Каманда Віцебскай вобласці, як і кожны год, вызначылася выдатнай падрыхтоўкай. Дзесяць дыпломаў I, II і III катэгорый і пахвальныя лісты – відавочны паказчык выдатна сфарміраваных у вучняў 4 К, так запатрабаваных сучасным жыццём. Каманда мае добры ўзровень крытычнага мыслення, неабходны для аналізу ўласнай дзейнасці, крэатыўнасць у інтэрпрэтацыі набытых ведаў, камунікатыўныя здольнасці пры ацэнцы атрыманай інфармацыі. А здольнасць да кааперацыі – быць у камандзе і падтрымліваць сяброў – відавочная!

Вельмі радуе тое, што выкладчыкі кафедры беларускага мовазнаўства маюць непасрэднае дачыненне да высокіх вынікаў выступлення каманды, бо штогод на вучэбных зборах па падрыхтоўцы да заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды шчыруюць разам з вучнямі».

**Працяг на 10-й стар.**

# ПАДРЫХТОЎКА НА ВЫДАТНА

Заканчэнне. Пачатак на 9-й стар.



Заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце «Геаграфія» праходзіў у горадзе Маладзечна Мінскай вобласці. Ён уключаў наступныя туры: тэарэтычны, мультымедыйны і праектна-практычны. Для тых, хто жадаў паўдзельнічаць у міжнародных спаборніцтвах па геаграфіі, быў арганізаваны дадатковы тур на англійскай мове.

**Ірына ГЛАДКАЯ,<br>намеснік дэкана<br>па вучэбнай рабоце<br>педагагічнага факультэта,<br>член журы:**

«Заданні тэарэтычнага этапу былі прадстаўлены 4 блокамі, якія закраналі розныя тэматычныя вобласці ведаў па фізічнай і сацыяльна-эканамічнай геаграфіі, геалогіі. Мультымедыйны тур складаўся з 30 тэставых пытанняў, якія суправаджаліся картамі, схемамі, фотаздымкамі, графікамі, дыяграмамі.

Спецыфіку рэспубліканскай алімпіяды па геаграфіі вызначаў праектна-практычны тур, на якім трэба было распрацаваць маршрут з прыпынкамі і апісаць яго, прапанаваць план забудовы ўчастка і г.д.

Я з'яўляюся членам журы ўжо трэці год запар і лічу, што ўзровень падрыхтоўкі вучняў з кожным разам павышаецца. Дзеці спраўляюцца з усімі заданнямі на выдатна!

У гэтым годзе вучні Віцебскай вобласці заваявалі 13 дыпломаў. І гэта наша агульная заслуга, бо ў падрыхтоўцы былі задзейнічаны выкладчыкі ВДУ: Аляксандр Галкін, прафесар кафедры экалогіі і геаграфіі, Аляўціна Цімашкова, Сяргей Курдзін і Алена Шаматульская, старшыя выкладчыкі кафедры экалогіі і геаграфіі.



Заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» праходзіў на базе Віцебскага кадэцкага вучылішча. Па традыцыі было чатыры туры: адзін тэарэтычны, дзе ўдзельнікі выконвалі пісьмовыя заданні; і тры практычныя (плаванне на дыстанцыі 50 метраў; комплекснае заданне па спартыўных гульнях – валейбол, футбол, гандбол, баскетбол; вызначэнне ўзроўню фізічнай падрыхтаванасці – чаўночны бег 4x9 м, скачок у даўжыню з месца, падцягванне на перакладзіне для юнакоў, падыманне тулава за 1 хвіліну для дзяўчат).

Каманда Віцебскай вобласці паказала добрыя вынікі. На рахунку ў хлопцаў і дзяўчат – пяць дыпломаў: адзін дыплом II ступені і чатыры – III ступені.

**Марына ХЛОПЦАВА,<br>старшы выкладчык кафедры<br>спартыўна-педагагічных<br>дысцыплін, адказны сакратар:**

«Алімпіяда па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» самая маладая: праходзіць у чацвёрты раз, але выклікае цікавасць сярод школьнікаў.

Па выніках абласнога этапу адбіраюцца лепшыя прадстаўнікі для ўключэння іх у склад каманды Віцебскай вобласці. Затым для іх Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі (куратар – метадыст цэнтра педагагічных ініцыятыў у працы з інтэлектуальна адоранымі і высокаматываванымі навучэнцамі Пётр Іванавіч Кавальчук) арганізуе вучэбна-трэніровачныя зборы для падрыхтоўкі да заключнага этапу алімпіяды.

У зборах у якасці педагогаў прымаюць удзел як высокакваліфікаваныя настаўнікі па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе», так і трэнеры спецыялізаваных дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ, і выкладчыкі нашага ўніверсітэта.

Напрыклад, у гэтым навучальным годзе да заключнага этапу алімпіяды каманду Віцебскай вобласці рыхтавалі дацэнты кафедры спартыўна-педагагічных дысцыплін Вадзім Хлопцаў і Алег Пракопаў, а таксама старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Аляксандра Вільчык».



Заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце «Кітайская мова» праходзіў у Гомелі на базе Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі з мэтай стымулявання беларускіх студэнтаў да вывучэння кітайскай мовы, павышэння іх лінгвістычнай кампетэнцыі, падтрымкі таленавітай моладзі і папулярызацыі кітайскай мовы і культуры. Арганізатарамі выступілі Міністэрства адукацыі і Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ.

**Ма Лун,<br>старшы выкладчык<br>кафедры сусветных моў,<br>член журы:**

«Алімпіяда праходзіла ў два этапы: пісьмовы і вусны. У першым туры вучні выконвалі заданні па лексіцы, граматыцы кітайскай мовы, а таксама рабілі пераклад з кітайскай на рускую мову і з рускай на кітайскую. У другім – школьнікі выступалі з вусным выказваннем па прапанаванай тэме, а таксама выконвалі заданні па аўдзіраванні. У гэтым годзе я таксама рыхтаваў вучняў да алімпіяды».

Заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце «Матэматыка» праходзіў у горадзе Слоніме Гродзенскай вобласці і сабраў больш за 160 вучняў з усёй Беларусі.

**Сяргей ШЛАПАКОЎ,<br>дацэнт кафедры геаметрыі<br>і матэматычнага<br>аналізу, кандыдат фізіка-<br>матэматычных навук,<br>дацэнт, член журы:**

«Вось ужо больш за 10 гадоў я з'яўляюся членам журы. І з года ў год вучні з Віцебскай вобласці становяцца лепшымі. Узровень падрыхтоўкі павышаецца.

Вынікі сённяшняга года – 17 дыпломаў (4 – I ступені, 6 – II ступені, 7 – III ступені), большасць з якіх атрымалі вучні з гімназіі № 2 горада Віцебска.



Дарэчы, там падрыхтоўкай хлопцаў і дзяўчат да алімпіяды па матэматыцы займаюцца выкладчыкі ФМіІТ нашага ўніверсітэта.

У гэтым годзе алімпіяда па вучэбным прадмеце «Матэматыка» праходзіла ў два туры, у кожным з якіх трэба было рашыць па чатыры задачы рознага ўзроўню. Час для выканання работы – 4–5 гадзін.

**Дзяніс ШКІР'ЯНАЎ,<br>праарэктар ВДУ,<br>старшыня журы:**

«Штогод выкладчыкі ВДУ з'яўляюцца членамі журы абласнога і рэспубліканскага этапаў алімпіяды, бо гэта выдатная магчымасць бліжэй пазнаёміцца з патэнцыяльнымі абітурыентамі і правесці прафарыентацыйную працу. Так, напрыклад, на факультэце фізічнай культуры і спорту ВДУ сёння навучаецца 8 хлопцаў і дзяўчат, якія з'яўляліся ўдзель-нікамі розных этапаў алімпіяды па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе», з іх двое – пераможцы заключнага этапу алімпіяды мінулага навучальнага года».

Падрыхтавала Алеся МЯДЗІЛЬ.